7 (156)
ліпень

Выдаецца са студзеня 1993 г.

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1221 ад 8 лютага 2010 г.

Выходзіць 12 разоў у год (з ліпеня 2003 г.)

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

## НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар* *Максім Навумавіч Гальпяровіч*

***Рэдакцыйная калегія:***
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часнoўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Іван Крэнь, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

***Рэдакцыя:***
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактары аддзелаў — **Надзея Кушнер, Вітаўт Чаропка**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Галіна Шалюта**.

## ЗМЕСТ

### ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Рыгор Лазько — Палітыка Савецкай Расіі ў дачыненні да Беларусі ў святле нацыянальнай праграмы партыі бальшавікоў (кастрычнік 1917 г. — пачатак 1919 г.) 3

### ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

Сяргей Новікаў — Абарона Магілёва 1941 года: новыя звесткі 12

### ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Алена Смірнова — "Шыкоўны часаслоў герцага Берыйскага" і яго мініяцюры "Поры года" 17

Юрый Лаўрык — Заснаванне і дзейнасць манастырскай друкарні ў Куцейне ў XVII ст. 24





**Аляксандр КОРЗЮК**

# Славесны метад навучання гісторыі: характарыстыка і прыёмы

*Пры падрыхтоўцы да ўрокаў настаўніку неабходна дакладна ўсведамляць, якія метады і прыёмы ён будзе выкарыстоўваць для таго, каб дасягнуць вырашэння пастаўленых педагагічных мэт і задач. Для гэтага неабходна добра арыентавацца ў метадычных асновах выкладання гісторыі, умець падбіраць і прымяняць найбольш адпаведныя зместу ўрока метады і прыёмы.*

Метад навучання — адна з найважнейшых катэгорый дыдактыкі. Правільны выбар метадаў навучання — гэта ключ для дасягнення трыадзінай мэты ўрока. Гэта самы рухомы, самы дынамічны кампанент вучэбнага працэсу, цесна звязаны з усімі астатнімі яго бакамі. Большасць дыдактаў трактуюць паняцце метад навучання як спосаб работы настаўніка і вучняў, пры дапамозе якога адбываецца авалоданне ведамі, уменнямі і навыкамі, фарміруецца светапогляд вучняў, развіваюцца іх пазнавальныя здольнасці. Савецкі метадыст С.А.Ляжова пад метадамі навучання разумее "спосабы ўзаемазвязанай дзейнасці настаўніка і вучняў у працэсе навучання, накіраваныя на дасягненне яго мэт"[1]. Важна мець на ўвазе, што з дапамогай метадаў навучання прама або ўскосна абавязкова праектуецца пазнавальная дзейнасць вучняў. Менавіта з іх дапамогай пры вывучэнні вучэбнага матэрыялу ўстанаўліваецца глыбокая сувязь паміж дзейнасцю настаўніка і пазнавальнай дзейнасцю вучняў.

Падчас навучання настаўнік выкарыстоўвае метады выкладання, якія ён вызначае для кіравання дзейнасцю вучняў, таму яны з'яўляюцца прадвызначальнымі ў вучэбным працэсе.

Метады пазнавальнай дзейнасці вучняў адносяцца да *метадаў вучэння*, якія садзейнічаюць засваенню вучэбнага матэрыялу і агульнаму развіццю асобы вучня. Вызначальную ролю адыгрываюць метады вучэння, бо з іх дапамогай забяспечваецца засваенне зместу вучэбнага матэрыялу.

Кожны метад навучання мае добра вызначаную мэту, алгарытм яе рэалізацыі, адпаведныя сродкі і



***КОРЗЮК Аляксандр Аляксандравіч.***
*Загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Мінску. У 1999 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка, у 2003 г. — аспірантуру пры ім. Лаўрэат прэміі Мінгарвыканкама (2001 г.) і прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў "За асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі" (2005 г.). Аўтар каля 90 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку метадычнага дапаможніка "Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII — пачатак XX ст.): метад. дапам." (Мн., 2005), вучэбна-метадычнага дапаможніка "Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе" (Мн., 2010, 2011), вучэбна-метадычнага комплексу факультатыўных заняткаў "Беларускія землі ў складзе Расійскай Імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (у саатт. Мн., 2010).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чакаемы вынік навучання. Таму, на нашу думку, **метад навучання** — гэта спосаб арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў з загадзя вызначанымі задачамі, узроўнямі пазнавальнай актыўнасці, вучэбнымі дзеяннямі і чакаемымі вынікамі для дасягнення дыдактычных мэт.

Да педагагічных катэгорый адносіцца таксама паняцце **прыём навучання**. Практычна ўсе педагогі адзінадушныя ў яго вызначэнні: прыём навучання — гэта састаўная частка або асобны від метаду, накіраваны на рашэнне канкрэтнай задачы. Таму метад можна разглядаць таксама як пэўную сістэму прыёмаў. Прыём навучання, як і метад, уяўляе сабой адну або некалькі вучэбных аперацый, якія накіраваны на дасягненне мэт абранага метаду[2].

Пры вызначэнні сістэмы метадаў навучання трэба ўлічваць шмат фактараў. Не выпадкова ў дыдактыцы і прадметных методыках існуе мноства розных класіфікацый метадаў. **Класіфікацыя метадаў навучання** — гэта ўпарадкаваная па вызначаных прыкметах сістэма. Універсальнай класіфікацыі метадаў навучання, прызнанай усімі дыдактамі, не існуе. Цяжкасць заключаецца ў падборы адзіных крытэрыяў для групіроўкі існуючых метадаў навучання. Таму ў залежнасці ад абранага прынцыпу ў айчыннай дыдактыцы існуе некалькі класіфікацый.

У артыкуле спынімся на класіфікацыі метадаў навучання *па крыніцах ведаў*. Згодна з ёй, на метады навучання найбольшы ўплыў аказваюць тыя крыніцы інфармацыі, з якіх чэрпаюць веды вучні. Таму вылучаюцца тры групы метадаў, у кожнай з якіх выкарыстоўваюцца свае крыніцы ведаў: **славесныя** (вуснае або друкаванае слова), **наглядныя** (назіраемыя прадметы, з'явы, наглядныя дапаможнікі) і **практычныя** (практычныя дзеянні, арыентаваныя на атрыманне ведаў, выпрацоўку уменняў і навыкаў). Аднак менавіта таму, што дадзеная класіфікацыя пабудавана на ацэнцы толькі адной уласцівасці метаду, настаўніку варта памятаць пра тое, што кожны метад навучання адначасова можа вызначацца не толькі па характары крыніцы вучэбнай інфармацыі, але і па ўзроўню самастойнасці вучняў у пазнавальным працэсе, і па форме разумовай дзейнасці і г. д.[3].

Большасць педагогаў, даючы азначэнне метадаў навучання, паказваюць іх цесную сувязь з мэтамі навучання. Дасягненне мэты выступае як крытэрый эфектыўнасці метаду, правільнасці яго рэалізацыі. Таму становіцца зразумелым, што выбар метадаў навучання не можа быць адвольны. Савецкі дыдакт Ю.К.Бабанскі сфармуляваў шэсць асноўных крытэрыяў выбару метадаў навучання, якія павінны комплексна выкарыстоўвацца:

1. Адпаведнасць мэце ўрока, максімальная скіраванасць на рашэнне трох яе аспектаў.
2. Адпаведнасць зместу вучэбнага матэрыялу.
3. Адпаведнасць формам арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, бо індывідуальныя, франтальныя, групавыя і калектыўныя формы пазнавальнай дзейнасці патрабуюць розных метадаў навучання.
4. Адпаведнасць рэальным вучэбным магчымасцям школьнікаў.
5. Педагог павінен улічваць адпаведнасць выбару метадаў навучання сваім магчымасцям (узроўню тэарэтычнай і практычнай падрыхтаванасці, асабістым якасцям і г. д.) па іх выкарыстанню.
6. Адпаведнасць заканамернасцям эфектыўнай пабудовы працэсу навучання і асноўным дыдактычным прынцыпам[4].

Акрамя гэтага, немалаважную ролю адыгрываюць матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне навучальнай установы, наяўнасць неабходных наглядных дапаможнікаў і сродкаў навучання. Пры выбары метадаў навучання варта таксама браць пад увагу метадычны апарат вучэбнага дапаможніка і іншых элементаў вучэбна-метадычнага комплексу па прадмеце.

У адукацыйным асяроддзі асноўным носьбітам інфармацыі па прадмеце з'яўляецца вуснае і друкаванае слова. Улічваючы, што гісторыя мае ў большасці сваёй матэрыял, які нельга непасрэдным чынам адчуваць, то становіцца відавочным, што славесны метад займае вядучае месца на ўроках па прадмеце, нягледзячы на тое, што на сучасным уроку гісторыі вуснае слова выкарыстоўваецца разам з друкаванымі і электроннымі сродкамі навучання. **Славесны метад навучання** — гэта спосаб атрымання ведаў вучнямі пры дапамозе вуснага або друкаванага слова.

Славесны метад выкладання вучэбнага матэрыялу настаўнікам становіцца для школьнікаў асноўным прыкладам вуснай мовы і з'яўляецца важным фактарам развіцця іх уласнай маўленчай культуры. Таму да вуснага выкладання зместу прадмета настаўнікам прад'яўляецца шэраг *метадычных патрабаванняў*.

Рэалізацыя славеснага метаду навучання дасягаецца толькі ў выніку работы настаўніка над сваёй вуснай мовай. Вуснае выкладанне матэрыялу настаўнікам павінна быць даступным, наглядным і канкрэтным. Каб дасягнуць гэтага, ён павінен імкнуцца развіваць памяць як сваю, так і вучняў, творчае ўяўленне, без якіх нельга стварыць змястоўныя вобразы вывучаемых з'яў і падзей. Істотнае і галоўнае па ходу выкладання трэба вылучаць інтанацыйна, падкрэсліваць больш павольным тэмпам гаворкі, паўтараць высновы.

Вуснае слова прымусовае па тэмпу ўспрымання. Ёсць вучні, якія ўспрымаюць і запамінаюць пачутае імгненна, самастойна робяць высновы і абагульненні. Іншым жа патрабуецца больш часу на

фіксацыю, асэнсаванне і ўсведамленне пачутага. Таму тэмп выкладання павінен быць ні занадта хуткім, ні занадта павольным. У працэсе слухання вучням не заўсёды проста вылучыць галоўнае ў аповядзе. Для гэтага настаўніку неабходна мець дакладны план апавядання, прадумаць пераходы ад аднаго пытання да іншага, лагічна завяршаць высновай або абагульненнем кожную частку свайго паведамлення.

Немалаважнымі з'яўляюцца і патрабаванні да мовы самога настаўніка. Яна павінна быць яркай, вобразнай, простай і выразнай, свабоднай ад слоў-паразітаў. Паскарэнне або запаволенне тэмпу, павышэнне ці паніжэнне голасу, кароткая паўза, іронія, абурэнне, захапленне — усё гэта павышае даступнасць прамовы, узмацняе яе ўздзеянне на вучняў. Міміка і жэстыкуляцыя, выкарыстаныя з пачуццём меры, павышаюць дзейснасць вуснага слова педагога.

На ўроках гісторыі вуснае выкладанне матэрыялу ажыццяўляецца з дапамогай розных прыёмаў. Да *маналагічных прыёмаў* адносяцца апавяданне (аповяд), апісанне, характарыстыка, тлумачэнне і разважанне; да *дыялагічных* — гутарка.

**Апавяданне** — гэта непрацяглае па часе, паслядоўнае, даступнае, эмацыянальнае паведамленне, у якім характарызуецца час, прастора, людзі. Эфектыўнасць дадзенага прыёму залежыць ад умення настаўніка распавядаць, а таксама ад выканання шэрага *метадычных патрабаванняў* да апавядання. Яно павінна выконваць наступныя функцыі:

— забяспечваць ідэйна-маральную накіраванасць выкладання;

— садзейнічаць дасягненню дыдактычных мэт урока;

— прымаць дакладныя і навукова правераныя гістарычныя факты;

— уключаць дастатковую колькасць яркіх і пераканаўчых прыкладаў, фактаў, падзей;

— мець выразную логіку, выкладацца простай і даступнай мовай;

— быць эмацыянальным, адлюстроўваць элементы асабістай ацэнкі і адносін настаўніка да вывучаемых гістарычных падзей;

— быць кароткім, не больш за 10 хвілін;

— яго змест павінен абапірацца на вопыт вучняў, адначасова пашыраць і ўзбагачаць яго новымі ведамі.

Расійскі педагог М.Ц.Студзянікін вылучае наступныя *віды апавядання*:

1. *Сюжэтнае апавяданне* — гэта падрабязны эмацыянальны расказ. Галоўныя факты ўзнаўляюцца ў ім дынамічна, як у мастацкім аповядзе. У яго аснове, як правіла, ляжыць канфліктная сітуацыя, якая развіваецца ў адпаведнасці з сюжэтнай схемай "завязка — кульмінацыя — развязка". На ўроках гісторыі падобны аповяд прымяняецца пры вывучэнні найбольш буйных падзей: паўстанняў, войнаў, палітычных пераваротаў.

Паколькі тыповыя з'явы грамадскага і сацыяльна-эканамічнага жыцця, маральна-этычныя і духоўныя якасці гістарычных асоб можна эфектыўна праілюстраваць праз лёс асобнага персанажа або праз дыялог дзвюх асоб (прадстаўнікоў розных грамадскіх груп), то на ўроках гісторыі, асабліва ў V—VII класах, можна выкарыстоўваць такія формы сюжэтнага апавядання, як персаніфікацыю і драматызацыю. Прыём персаніфікацыі (або ўвасаблення) запазычаны з мастацкай літаратуры. Ён заключаецца ў тым, што тыповыя гістарычныя з'явы раскрываюцца праз аповяд ад першай асобы, як правіла, выдуманай, дае магчымасць зразумець тыповыя з'явы жыцця грамадства і растлумачыць складаныя гістарычныя з'явы. Прыём персаніфікацыі можа быць дапоўнены прыёмам драматызацыі, які заключаецца ва ўвядзенні ў аповяд настаўніка дыялогу, таксама выдуманага ці запазычанага з гістарычных дакументаў, або пастаноўцы інсцэніровак.

2. *Вобразнае апавяданне* ў параўнанні з сюжэтным змяшчае больш тэарэтычных звестак і перадае іх у спакойнай, бесканфліктнай форме. Дадзены прыём часцей за ўсё ўжываецца пры вывучэнні з'яў і працэсаў эканамічнай і сацыяльнай сфер жыцця грамадства і можа паспяхова выкарыстоўвацца з умоўна-графічнай нагляднасцю.

3. *Канспектыўнае апавяданне* (або кароткае паведамленне) выкарыстоўваецца тады, калі неабходна за кароткі адрэзак часу паведаміць вучням значны аб'ём інфармацыі. У ім толькі ўказваецца на пэўныя падзеі, іх ход і вынікі; адсутнічаюць разгорнутыя прасторавыя, часавыя і колькасныя характарыстыкі вывучаемых фактаў.

Аповяд настаўніка з'яўляецца сінтэтычным прыёмам вуснага выкладання і можа ўключаць у сябе розныя віды апісання, характарыстыкі, тлумачэнне, разважанне ў спалучэнні з выкарыстаннем наглядных і друкаваных крыніц ведаў.

**Апісанне** — раскрыццё знешніх прыкмет аб'екта — рысы, дэталі, уласцівасці, функцыі і становішча. У адрозненне ад апавядання, апісанне мае аб'ект, але не мае сюжэта. Яго галоўныя рысы — вобразнасць і канкрэтнасць. Настаўнік павінен з дапамогай славеснага метаду так "намаляваць" прадмет, падзею, з'яву, каб вучань пазнаў іх, убачыў на ілюстрацыі або быццам бы "жыўцом". Таму важнымі патрабаваннямі да гэтага прыёму выступаюць падбор дакладных слоў і параўнанняў, звязнасць і паслядоўнасць апісання.

Апісанне бывае карцінным і аналітычным. *Карціннае апісанне* — гэта прыём вуснага выкладання, з дапамогай якога ў эмацыянальна-мастацкай форме ствараюцца вобразы таго ці іншага факта. Дадзены прыём ужываецца для раскрыцця побыту людзей, геаграфічнага асяроддзя, з'яў культурна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

га, грамадскага, гаспадарчага жыцця. Яно дазваляе выкарыстоўваць дакументальныя фатаграфіі, геаграфічныя і гістарычныя карты, схемы, дакументы, мастацкую літаратуру, карціны, рэпрадукцыі і г. д. *Аналітычнае апісанне* змяшчае апісанне састаўных частак, дэталей якіх-небудзь з'яў, знешніх прыкмет ствараемых цэласных вобразаў і іх узаемадзеяння. Яно выкарыстоўваецца пры апісанні прылад працы, бытавых прадметаў, зброі, помнікаў архітэктуры, ваенных і гаспадарчых аб'ектаў і можа спалучацца з крэйдавымі малюнкамі, схемамі, чарцяжамі, з дэманстрацыяй макетаў і мадэлей.

**Характарыстыка** — выяўленне тыповых рыс грамадскага жыцця, якія раскрываюць унутраную сутнасць таго, што адбываецца. У характарыстыцы адсутнічае сюжэт, таму яе часам называюць разнавіднасцю апісання. Аднак розніца ёсць. Апісанне характарызуе знешнія праявы аб'ектаў у статычным становішчы, а характарыстыка — іх унутраную сутнасць у дынамічным развіцці. Характарыстыка можа быць *кароткай* і *разгорнутай*. Разгорнутая характарыстыка павінна змяшчаць факты, на аснове якіх у ёй фармулююцца падагульняючыя высновы.

Характарыстыка бывае *вобразнай, параўнальнай і абагульняючай*. На ўроках гісторыі прымяняюцца ўсе яе віды. Напрыклад, *вобразная характарыстыка* даецца адзінкавым прадметам, фактам, тыповым з'явам, прадстаўнікам сацыяльных груп, выдатным гістарычным дзеячам. *Параўнальная характарыстыка* прымяняецца пры выкладанні тэарэтычнага вучэбнага матэрыялу. Напрыклад, параўноўваюцца формы дзяржаўнай улады на розных этапах развіцця дзяржавы, эканамічнае становішча і г. д. Абагульняючая характарыстыка падводзіць вынік вывучанаму тэарэтычнаму матэрыялу. Абагульняючы што-небудзь, у лагічнай паслядоўнасці пералічваюць асноўныя рысы вывучаемай з'явы, самае істотнае ў ёй. Таму абагульняючая характарыстыка прымяняецца, калі скончана вывучэнне складанай, шматпланавай з'явы і ў сціслым абагуленым выглядзе трэба падкрэсліць яе сутнасць, выявіць яе істотныя прыкметы і іх сувязі.

**Тлумачэнне** — раскрыццё з дапамогай лагічных прыёмаў і пераканаўчай аргументацыі ўнутранай сутнасці грамадскіх з'яў, заканамерных сувязей і залежнасцей паміж імі. Яно выкарыстоўваецца часцей за ўсё пры вывучэнні тэарэтычнага матэрыялу. Тлумачэнне падводзіць вучняў да засваення паняццяў, прычын, вынікаў і значэння галоўных гістарычных фактаў, матываў і вынікаў дзейнасці людзей, да аналізу і ацэнкі культурна-гістарычнай спадчыны, да фарміравання ўласных ідэй і пераканнняў. Прыём тлумачэння лічыцца самым эканамічным па часе спосабам перадачы складанай вучэбнай інфармацыі. Неабходна, каб па ходу тлумачэння настаўніка вучні ўмелі вылучыць у ім сутнасць і сэнсавую нагрузку, навучыліся аргументавана даказваць сваю пазіцыю. Улічваючы гэта, прымяненне настаўнікам прыёму тлумачэння патрабуе дакладнага і выразнага фармулявання сутнасці праблемы; паслядоўнага раскрыцця прычынна-выніковых сувязей, аргументацыі і доказаў, выкарыстання параўнання, супастаўлення, аналогіі, прымянення яркіх прыкладаў, выразнай логікі выкладання.

Калі неабходна раскрыць і абгрунтаваць тэарэтычныя вывады і абагульненні, выкладанне настаўнікам матэрыялу набывае характар разважання. **Разважанне** — прыём вуснага выкладання матэрыялу, заснаваны на аналізе і абагульненні фактаў, паслядоўным раскрыцці прычын, вынікаў і ўзаемасувязей, які падводзіць вучняў да ўсведамлення тэарэтычных абагульненняў і высноў. Разважанне суправаджаецца пастаноўкай пытанняў, на кожнае з якіх настаўнік дае адказ, супастаўляючы розныя факты і меркаванні. У выніку вучні без асаблівых цяжкасцей асэнсоўваюць складаны тэарэтычны змест вучэбнага матэрыялу. Пры гэтым могуць выкарыстоўвацца лагічныя схемы, розныя тэкставыя табліцы і г. д.

Разгорнутае тэарэтычнае разважанне, якое падводзіць вучняў да тэарэтычнага абагульнення і асэнсавання зместу канкрэтнага вучэбнага матэрыялу, патрабуе звароту настаўніка да выкарыстання такой формы правядзення ўрока, як *вучэбная лекцыя*. Метадычныя ўмовы прымянення лекцыі ў адукацыйным працэсе па гісторыі і патрабаванні да яе эфектыўнага правядзення будуць разгледжаны намі ў адным з наступных артыкулаў.

**Гутарка** — дыялогавая форма зносін настаўніка і вучняў у выглядзе пытанняў і адказаў. У яе працэсе настаўнік шляхам пастаноўкі добра прадуманых пытанняў падводзіць вучняў да разумення новага матэрыялу або правярае засваенне імі ўжо вывучанага. Эфектыўнасць яе правядзення шмат у чым залежыць ад правільнасці пастаноўкі пытанняў. Яны павінны быць выразнымі, кароткімі, змястоўнымі, задавацца ўсяму класу і спрыяць актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, быць рознай ступені складанасці і мець адкрытую форму.

У дыдактычнай літаратуры прапанавана некалькі варыянтаў *класіфікацый гутарак*. У залежнасці ад мэты, якая ставіцца перад гутаркай, яна можа быць: па месцы на ўроку — уступнай, абагульняючай, заключнай; па характару дыялогу — кантрольнай і эўрыстычнай (аналітыка-сінтэтычнай); па колькасці ўдзельнікаў — індывідуальнай і франтальнай.

Праводзячы гутарку, неабходна пасля магчымых няправільных адказаў з дапамогай навадных пытанняў накіроўваць думку вучняў у патрэбнае рэчышча. Пасля правільнага адказу трэба адзначыць цікавае выказванне вучня, аднак не варта аб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мяжоўвацца адным адказам на пастаўленае пытанне, заахвочваючы школьнікаў да далейшай разумовай дзейнасці і патрэбы самім задаваць пытанні. У ходзе гутаркі неабходна сачыць за выказваннямі вучняў, логікай пабудовы іх адказаў і адпаведнасці зададзенаму пытанню.

Гутарка мае дастатковы патэнцыял для арганізацыі эфектыўнага засваення або праверкі ведаў. Аднак настаўніку варта памятаць, што яе падрыхтоўка і правядзенне могуць патрабаваць шмат часу. Выбіраючы тэму для гутаркі, неабходна прааналізаваць свае магчымасці і гатоўнасць класа да яе правядзення, прадумаць выхады з магчымых незапланаваных сітуацый, мець запасны варыянт плана ўрока ў выпадку няўдачы або зацягвання гутаркі. Існуе небяспека адхіліцца ад тэмы ўрока або зусім сысці ў бок. Часта настаўніку бывае цяжка па ходу гутаркі сфармуляваць карэкцыруючыя дадатковыя пытанні, а большасць вучняў могуць застацца яе пасіўнымі ўдзельнікамі. Усё гэта неабходна ўлічваць пры планаванні і падрыхтоўцы гутаркі[6].

Падводзячы вынік характарыстыкі прыёмаў славеснага метаду навучання гісторыі, адзначым, што, як правіла, на пэўным уроку яны рэдка калі ўжываюцца ў чыстым выглядзе, ізалявана адзін ад аднаго. Іх мэтанакіраванае і камбінаванае прымяненне здольна аказаць істотны ўплыў на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў і, як вынік, павышэнне эфектыўнасці засваення зместу вучэбнага гістарычнага матэрыялу.

[1] Методика преподавания истории в средней школе. М., 1986. С. 121.

[2] Лернер И.Я. Дидактическая система методов обучения. М., 1976.

[3] Конаржевский Ю.А. Анализ урока. М., 2000. С. 26.

[4] Бабанский Ю.К. Основные условия и критерии оптимального выбора методов обучения // Проблемы методов обучения в современной общеобразовательной школе. М., 1971. С. 48—56.

[5] Студеникин М.Т. Методика преподавания истории в школе : учеб. для студ. высш. учеб. заведений. М., 2003. С. 60—66; Вагин А.А. Основные вопросы методики преподавания истории в старших классах: пособие для учителя. М., 1959. С. 14.

[6] Багдановіч І.І. Методыка выкладання гісторыі ў школе. Мн., 2009. С. 172.

**Рэдакцыя "Беларускага гістарычнага часопіса" з другога паўгоддзя бягучага года прапануе чытачам шэраг тэарэтычных матэрыялаў пад рубрыкай "Школа маладога настаўніка". Яна была адкрыта ў № 6 часопіса артыкулам загадчыка кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдата педагагічных навук, дацэнта Аляксандра Корзюка "Рабочая папка настаўніка гісторыі: неабходныя дакументы і матэрыялы".**

**На думку рэдакцыі, матэрыялы такога кшталту будуць садзейнічаць адаптацыі маладых настаўнікаў гісторыі да работы ў школе.**

## ТЭМЫ, ЯКІЯ БУДУЦЬ АСВЯТЛЯЦЦА Ў БЛІЖЭЙШЫХ НУМАРАХ:

* **МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ДАКУМЕНТАЛЬНАГА МАТЭРЫЯЛУ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ Ў АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ.**
* **НАГЛЯДНЫЯ СРОДКІ Ў НАВУЧАННІ ГІСТОРЫІ.**
* **ПРАКТЫЧНЫЯ МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ.**
* **АРГАНІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ ГІСТОРЫІ.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ